Источник: "Звязда" - 2025-04-02

## 2 КРАСАВІКА Даты Падзеі Людзі




**1832** год — нарадзіўся Павел Восіпавіч Баброўскі, беларускі гісторык, этнограф. З 1859 г. кіраваў групай афіцэраў Генеральнага штаба, якая падрыхтавала і выдала «Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Гродненская губерния». Выданне змяшчае звесткі аб эканоміцы, этнаграфіі, асвеце, аб гарадах і найбольш значных мястэчках губерні. Вывучаў гісторыю летапісаў, царквы, жыццё і навуковую дзейнасць вядомых людзей рэгіёна. Багаты гісторыка-этнаграфічны і геаграфічны матэрыял з'яўляецца важнай крыніцай па гісторыі Беларусі.

**1904** год — нарадзіўся Уладзімір Лявонцьевіч Акуліч, беларускі кінааператар, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. З 1947 года — на кінастудыі «Беларусьфільм». Зняў мастацкія фільмы «Гадзіннік спыніўся апоўначы», «Палеская легенда», «Рагаты бастыён», «Чалавек не здаецца» і інш. Аператар-пастаноўшчык тэлевізійнага мастацкага фільма «Побач з вамі».

**1927** год — нарадзіўся Генадзь Ільіч Лазюк, беларускі вучоны ў галіне медыцынскай генетыкі, член-карэспандэнт НАН Беларусі, член-карэспандэнт Акадэміі медыцынскіх навук СССР, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. Аўтар больш за 350 навуковых прац.




**1805** год — нарадзіўся Ганс Крысціян Андэрсен, дацкі пісьменнік і паэт, аўтар сусветна вядомых казак для дзяцей.

**1982** год — пачалася аргенцінска-брытанская вайна за Фалклендскія (Мальвінскія) астравы. Канфлікт цягнуўся 74 дні і скончыўся капітуляцыяй Аргенціны 14 чэрвеня і вяртаннем астравоў пад уладу Брытаніі. У час вайны загінулі 649 аргенцінскіх, 255 брытанскіх ваеннаслужачых, а таксама трое цывільных грамадзян.

**1996** год — у Маскве прэзідэнты Б. Ельцын і А. Лукашэнка падпісалі дагавор аб стварэнні саюзнай дзяржавы.